# Нацыянальная бібліятэка - першая на парадку дня

***25 жніўня адбылося чарговае пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь пад сгаршынствам міністра культуры РБ Леаніда Гуляка.***

Галоўным пытаннем, што стаяла на парадку дня, было абмеркаванне ходу работ па стварэнні "інтэлеюуальнага будынка" і перамяшчэнні інфармацыйных рхурсаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. 3 дакладам выступіў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі. На калегію былі запрошаны таксама спецыялісты, адказныя за ўвасабленне праекта Нацыянальнай бібліятэкі. На пасяджэнні, у прыватнасці, адзначалася, што на завяршальным этапе ўвядзення новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі працы вядуцца згодна з пратаколам даручэнняў Прэзідэнта РБ Аляксандра Лукашэнкі, дадзеных сёлета на нарадзе па пытаннях увядзення будынка Нацыянальнай бібліятэкі і стварэння рэспубліканскага інфармацыйнага і сацыякультурнага цэнтра, а таксама даручэнняў Прэзідэнта РБ па стварэнні Прэзідэнт-цэнтра, Міжнароднага прэс-цэнтра і залаў для правядзення сустрэч на вышэйшым узроўні.

Пастановай Савета Міністраў РБ ад 26.05.2005 г. № 555 зацверджана канцэпцыя стварэння на базе новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі рэспубліканскага інфармацыйнага і сацыякультурнага цэнтра. На яе аснове былі створаны канцэпцыі па ключавых накірунках дзейнасці: мастацкага афармлення будынка Нацыянальнай бібліятэкі; фарміравання інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі; канцэпцыя арганізацыі бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў Нацыянальнай бібліятэкі. Для іх рэалізацыі былі распрацаваны і зацверджаны адпаведныя праграмы і графікі, ажыццяўленне якіх вядзецца па вызначаных тэрмінах.

Распрацаваны таксама пакет дакументаў, якія рэгламентуюць працэсы падрыхтоўкі, перамяшчэння і разгортвання асобных напрамкаў дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі ў новым "інтэлектуальным будынку".

Працягваецца распрацоўка і аюуалізацыя ўжо існуючых нарматыўных дакументаў, якія рэгламентуюць дзейнасць Нацыянальнай бібліятэкі. Гэтая праца была распачата ў 2004 годзе. Усяго будзе распрацавана каля тысячы нарматыўных дакументаў. "Інтэлектуальны будынак" служыць матэрыяльнай асновай для стварэння комплексу інфармацыйна-тэхналагічных сістэм (КІТС).

У сувязі са стварэннем на базе Нацыянальнай бібліятэкі Прэзідэнт-цэнтра, Міжнароднага прэс-цэнтра і двух залаў для правядзення сустрэч на вышэйшым узроўні, рыхтуецца дакументацыя з удакладненымі спецыфікацыямі на камп'ютэрнае і іншае абсталяванне КІТС .

Нацыянальная бібліятэка ўдзельнічае ў працы Рэспубліканскай тэндэрнай камісіі па набыцці абсталявання для новага будынка. У красавіку 2004 г. былі завершаны тэндэрныя працэдуры на пастаўку стэлажнага абсталявання для высотнага сховішча. У выніку аналізу тэндэрных прапаноў вызначаны пераможцы: Навагрудскі завод металавырабаў, Мінскае вытворчае аб'яднанне вылічальнай тэхнікі, Віцебскі ВК "Белпрамкультура". Усяго будзе выраблена 5620 стацыянарных і мабільных стэлажоў больш за 100 мадыфікацый.

У II квартале 2005 г. Упраўленне капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама правяло тэндэры на пастаўку абсталявання і матэрыялаў для вонкавага асвятлення, на абсталяванне цэнтра кансервацыі і рэстаўрацыі кніг, на праграмы кіравання аўтамагазаванымі сістэмамі пажарнай бяспекі і інш., а ў чэрвені пачало тэндэрную працэдуру па закупцы першай чаргі абсталявання КІТС.

Працягваюцца працы па мастацкім афармленні будынка. У прыватнасці, ухвалены 32 эскізныя праекты; завершана эскізнае праектаванне мастацкага афармлення музейнага комплексу. Складнікам мастацкага афармлення стане візуальна-арыентуючая інфармацыя. Пераможцам тэндэраў па мастацкім афармленні новага будынка бібліятэкі стаў МУП "Скульптурны камбінат".

Паэтапная кансервацыя і ўпакоўка фондаў Нацыянальнай бібліятэкі распачалася ў мінулым верасні. У першую чаргу былі законсерваваны малавыкарыстоўваемыя фонды. Да 15 жніўня гэтага года да пераезду падрыхтаваны больш за шэсць мільёнаў адзінак захавання (74,5% ад агульнага аб'ёму фонду).



Фота Юрыя ІВАНОВА

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Здымак зроблены 22 жніўня 2005 г.**

У Нацыянальнай бібліятэцы працягваецца пераразмеркаванне абменных фондаў у публічныя і спецыяльныя бібліятэкі розных ведамаснага падпарадкавання, пагранічных застаў, дамоў ветэранаў, дзіцячых дамоў. Усяго перададзена каля 120 тысяч кніг і часопісаў.

Вядуцца працы па набыцці абсталявання для пераезду і па арэндзе неабходных транспартных сродкаў.

Разлічана, што колькасць персаналу па абслугоўванні новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі паэтапна ўзрасце да тысячы чалавек. У Нацыянальную бібліятэку запрашаюцца высокакваліфікаваныя спецыялісты рознага профілю. Так, на працу ў 2004 -2005 гг. бібліятэка замовіла 91 выпускніка дзевяці ВНУ краіны па 31 спецыяльнасці, 81 з іх ужо прыступілі да працы.

На калегіі адзначалася, што неабходна будзе дадаткова прадугледзець забеспячэнне спецыялістамі падраздзяленняў, звязаных з пашырэннем функцый НББ як рэспубліканскага інфармацыйнага і сацыякультурнага цэнтра, а таксама са стварэннем на базе Нацыянальнай бібліятэкі Прэзідэнт-цэнтра, Міжнароднага прэс-цэнтра.

Прынамсі, інфармацыйны і сацыякультурны цэнтр уключае ў сваю структуру фізкультурна-аздараўленчы комплекс, салон прыгажосці, рэстаран, кафэ, аглядныя пляцоўкі, таму ён патрабуе распрацоўкі механізма гаспадарання гэтых аб'ектаў на ўмовах самаакупляльнасці. На пасяджэнні калегіі было таксама разгледжана пытанне "Аб падрыхтоўцы арганізацый культуры да працы ў асенне-зімовы перыяд 2005 -2006 гг. і ходзе выканання праграмы па энергазберажэнні па выніках працы за I паўгоддзе 2005 года". Па гэтым пытанні на калегію былі запрошаны кіраўнікі ўстаноў культуры рэспубліканскага падпарадкавання. Выступоўцы адзначылі, што практычна ўсе ўстановы культуры падрыхтаваны да асенне-зімовага сезона. Падкрэслівалася, што і ў далейшым гэтая праца будзе кантралявацца Міністэрствам культуры.

На калегіі разглядалася яшчэ адно важнае пытанне: "Аб праектнай канцэпцыі Рэспубліканскай праграмы захавання і развіцця культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006 - 2010 гг."

Падрабязней аб надзённых пытаннях, якія абмяркоўваліся на калегіі, чытайце ў наступных нумарах "К".